Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
______________ А. А. Корбут
«_____»____________2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КАПЭЛА СМЫКАВАЙ І ДУДАРСКАЙ МУЗЫКІ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-18 01 01
Народная творчасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці
1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

2017

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-18 01 01-2013 па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць і вучэбнага плана па спецыялізацыі 1-18 01 01-05 01 Этнафоназнаўства, рэг. № С 18-1-24/13 вуч. ад 27.06.2013

**СКЛАДАЛЬНІК**
*В. В. Калацэй*, загадчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Т. А. Кухаронак*, старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*Л. Л. Ражкова*, загадчык кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 15.09.2016 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 19.10.2016 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: В. В. Калацэй

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма да вучэбнай дысцыпліны «Капэла смыкавай і дударскай музыкі» належыць да праграм блока спецыяльных дысцыплін (дысцыплін па выбары) вучэбнага плана падрыхтоўкі спецыялістаў па фальклоры і, у першую чаргу, прызначана для павышэння ўзроўню практычна арыентаванай прафесійнай адукацыі студэнтаў-фалькларыстаў і паглыбленага вывучэння імі беларускай традыцыйнай музычнай культуры.

Вучэбная дысцыпліна «Капэла смыкавай і дударскай музыкі» мае інтэграцыйны характар. Для яе засваення студэнты выкарыстоўваюць веды, уменні і навыкі, набытыя падчас вывучэння сумежных вучэбных дысцыплін: «Уводзіны ў беларускую спеўную этнафонію», «Тэхнічныя сродкі аўдыя-, відэазапісу», «Фальклорны практыкум» і інш., што забяспечвае іх комплекснае ўзаемадзеянне ў мэтах фарміравання ў студэнтаў сістэмнага ўяўлення аб будучай прафесійнай дзейнасці фалькларыста-практыка.

У сучаснай фалькларыстыцы і этнапедагогіцы асабліва актуальнай становіцца задача навуковага абгрунтавання стварэння і выкарыстання паводзінавых рэкрэацыйных сітуацый традыцыйнай культуры (народных свят, гулянняў, інтэрактыўных флэшмобаў, вячорак і інш., якія патрабуюць у якасці аўдыяфону этнічнай гукавой партытуры) у сучасных маладзёжных асяродках. Яе вырашэння патрабуе і падрыхтоўка студэнтаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі па фальклоры і блізкіх спецыяльнасцях, і сучасная прыватная ініцыятыва, якая распрацоўвае і тыражуе народныя музычныя інструменты Беларусі, рэканструяваныя ў XXI ст.: дуду, дуду-мацянку, альтэрню, басэтлю, традыцыйную скрыпку, гудок, гуслі і г. д.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – стварэнне этнакультурнага вобраза беларусаў у свядомасці студэнтаў сродкамі музычнага фальклору.

*Задачы:*

– развіць устойлівую цікавасць да фальклору;

– пашырыць сістэму ведаў пра законы і прынцыпы змены сезонаў і ўплыў гэтых змен на традыцыйнае мастацтва;

– сфарміраваць уменне вызначаць асноўную ідэю (напрамак) свят, абрадаў і звычаяў беларусаў; знаходзіць «форму» падачы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклорнага твора ў адпаведнасці з яго сезонам, выкарыстоўваючы неабходныя фальклорныя прыёмы і сродкі; выконваць песні, гульні і побытавыя танцы;

– сфарміраваць навыкі ўспрымання тэксту і лексікі нескладаных песень, гульняў і побытавых танцаў;

– сфарміраваць навыкі харавога музіцыравання з суправаджэннем, харавога калектыўнага музіцыравання з харэаграфічнымі рухамі;

– развіваць навыкі харавога калектыўнага музіцыравання.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны спецыяліст павінен *ведаць*:

– стан і перспектывы стварэння капэлы смыкавай і дударскай музыкі ў вучэбна-выхаваўчым і культуратворным працэсе ўстаноў культуры і адукацыі розных тыпаў;

– рацыянальныя падыходы да стварэння і кіравання капэлай смыкавай і дударскай музыкі ў вучэбным і выхаваўчым працэсах на аснове агульнапедагагічных і псіхалагічных патрабаванняў;

– аналітычныя і абагульняючыя звесткі па вопыце кіравання капэлай смыкавай і дударскай музыкі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны спецыяліст павінен *умець:*

– распрацоўваць планы вучэбных і выхаваўчых заняткаў навучання ігры ў капэле смыкавай і дударскай музыкі і праводзіць іх;

– аналізаваць фальклорныя помнікі ў якасці педагагічнага матэрыялу для стварэння рэпертуару капэлы смыкавай і дударскай музыкі;

– выкарыстоўваць сучасныя сродкі навучання і камп’ютары для спрашчэння дзейнасці па збіранні, апрацоўцы, захаванні рэпертуару капэлы смыкавай і дударскай музыкі;

– выпрабляць раздатачны матэрыял, падбіраць фальклорны матэрыял і заданні для індывідуальнай работы.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны спецыяліст павінен *валодаць*:

– навыкамі сольнага і ансамблевага выканальніцтва ў капэле;

– навыкамі знаходжання неабходнага ў навучальным працэсе рэпертуару ў сусветнай інфармацыйнай сістэме;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– навыкамі навучання ігры на народных інструментах для развіцця адпаведных творчых здольнасцей, задавальнення пазнавальных і прафесійных патрэб.

Засваенне вучэбнай праграмы па спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор) павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый.

**Акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і творчых задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных устройстваў, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп'ютарам.

АК-10. Валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-5. Карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі для шматбаковага забеспячэння арганізацыйна-кіраўніцкай дзейнасці ў галіне народнай творчасці.

ПК-15. Планаваць асноўныя этапы навуковых даследаванняў народнай творчасці.

ПК-18. Ажыццяўляць нагляд за бытаваннем розных відаў і жанраў народнай творчасці ў мэтах іх аховы і пераемнасці.

ПК-20. Ужываць новыя інавацыйныя тэхналогіі навучання, мультымедыйныя тэхналогіі, электронныя падручнікі, фоназапісы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-23. Планаваць рэпертуар уласных мастацкіх (музычных) твораў.

ПК-24. Працаваць з крыніцамі рэпертуару, літаратурай па народнай творчасці.

ПК-25. Арганізоўваць этапы працэсу выканання мастацкіх (музычных) твораў для эстэтычнага выхавання і фарміравання высокамастацкіх густаў насельніцтва.

ПК-26. Выступаць у якасці акцёра-выканаўцы ў прафесійных і аматарскіх музычных калектывах, драматычных тэатрах, музычных тэатрах, тэатрах-студыях, на радыё, тэлебачанні, у канцэртных установах.

У падмурак навукова-тэхнічнага забеспячэння вучэбнай дысцыпліны «Капэла смыкавай і дударскай музыкі», увасобленага ў аднайменным наборы інструментаў, увайшоў шматгадовы мастацкі, педагагічны досвед кандыдата філасофскіх навук, народнага майстра Віктара Кульпіна, выканальніцкі, мастацтвазнаўчы досвед дацэнта, кандыдата культуралогіі, дудара Вячаслава Калацэя, досвед дзейнасці па этнакультурным выхаванні аддзела фальклору ўстановы адукацыі «Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі» і спецыялізацыі «этнафоназнаўства» БДУКМ. Іх тэхналагічныя, творчыя і педагагічныя намаганні аб’яднала супрацоўніцтва ў працэсе выканання аднаго з заданняў дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі». У якасці рэпертуарнай асновы праграмы былі выкарыстаны найбольш эфектныя і найбольш пашыраныя ў постфальклорных асяродках XXI ст. фальклорныя адзінкі з розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Капэла смыкавай і дударскай музыкі» прадугледжана ўсяго 66 гадзін, з якіх 34 – аўдыторныя (лекцыі – 20, практычныя – 8, КСРС – 6).

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Уводзіны. Знаёмства з інструментамі капэлы*

Мэта, прадмет і задачы дысцыпліны. Гістарычныя звесткі пра склад капэл. Тэарэтычныя звесткі пра асноўны склад капэл траістай музыкі. Прыёмы ігры на традыцыйнай скрыпцы – інструменце капэлы смыкавай і дударскай музыкі. Першасны досвед калектыўнага музіцыравання ў складзе аднаго з відаў беларускай капэлы.

### Раздзел 1. Веснавы рэпертуар капэлы

*Тэма 1. «Яваравы мост»*

Вясна як час, які надыходзіць пасля зімы, калі Сонца па народных уяўленнях «ідзе да лета»; час доўгіх дзён і кароткіх начэй. «Аднаўленне» прыроды і абуджэнне прыродных працэсаў пад уплывам сонечнай актыўнасці, адлюстраванне адчування гэтага ў гукавой партытуры сезона.

Асаблівасці слоў, напеву, харэаграфічных рухаў і інструментальнага суправаджэння абранай рэгіянальнай веснавой гульні. Выкананне дэкламацыі слоў і напеву песні-гульні.

Педагагічныя магчымасці і асаблівасці выкарыстання інструментаў з капэлы смыкавай і дударскай музыкі ва ўстановах культуры і адукацыі, дадатковай адукацыі. Прынцыпы арганізацыі і выкарыстання інструментаў з капэлы смыкавай і дударскай музыкі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе ўстаноў культуры, адукацыі, дадатковай адукацыі.

*Тэма 2. «Ды ішла туча, туча цёмная»*

Звесткі пра тое, як на Вялікдзень амаль паўсюль у Беларусі па вёсках і мястэчках хадзілі валачобнікі, якія песнямі, скрыпкай, дудой і барабанам, іншымі музычнымі інструментамі віталі надыход вясны. Уяўленні пра тое, як іх заўсёды чакалі, таму што яны прыносілі ўсім добрае жыццё і долю. Асаблівасці «абыходнай» рытмікі валачобных песень.

Веснавое раўнадзенства, пасля якога, калі месяц круглы – у поўні – у Беларусі здаўна святкавалі Вялікдзень. Выраз пра тое, што «Вялікдзень настае, калі веснавое раўнадзенства сябруе з поўняй Месяца». Склад валачобнай дружыны (зачыналь-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нік, падхватнікі, дудар, скрыпач, механоша). Сувязі тэкстаў песень валачобнікаў з міфалагічнымі матывамі касмагоніі.

*Тэма 3. «У Юрачку», «Як пушчу стряло»*

Буйныя святы вясны з уласнай драматургіяй: Масленка як карнавальная сустрэча вясны і развітанне з зімой; Загуканне вясны як прыклад адухаўлення сіл адраджэння прыроды; Юр'я як свята пастухоў і супольных вячорак Юраўскай яечні. Адлюстраванне дыялогу з прыродай у напевах веснавых гульняў.

Карагоды як першасная форма каляндарных песень. Перазовы саліста і хору ў запевах і рэфрэнах карагодных веснавых песень.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі абранага рэгіянальнага веснавога карагода. Дэкламацыя слоў і развучванне яго напеву.

*Тэма 4. Выкананне веснавога рэпертуару капэлы*

Развучванне найгрышу да гульні «Яваравы мост» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі. Развучванне найгрышу да валачобнай песні «Ды ішла туча, туча цёмная» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі. Развучванне найгрышу да танца-гульні «У Юрачку» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі. Развучванне найгрышу да песні «Як пушчу стряло» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі.

## Раздзел 2. Летні рэпертуар капэлы

*Тэма 5. «Пойдзем дзеўкі (Лыгу-лыгу)»*

Лета як час, які надыходзіць пасля вясны, калі Сонца па народных уяўленнях «грае»; час найдаўжэйшых дзён і найкарацейшых начэй – Купалле. «Апагей» квітнення прыроды і абуджэнне прыродных працэсаў пад уплывам сонечнай актыўнасці і як наступства – «дагары накіраванасць» інтанавання купальскіх песень.

Звесткі пра тое, як у Купальскую ноч па вёсках і мястэчках Беларусі амаль паўсюль палілі вялікія вогнішчы. Звычай, калі хлопцы і дзяўчаты разам вадзілі вакол іх карагоды, танцавалі і спявалі да раніцы, а раніцай – сустракалі ўзыход сонца, купаліся ў рацэ, што, па народных павер'ях, прыносіла ўсім добрае

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

жыццё і долю. Купалле – ноч, у якую не спалі і ў якую не змаўкалі песні.

*Тэма 6. «Касары косяць»*

Сярэдзіна лета – час самых доўгіх дзён і кароткіх начэй. Золак плоднасці прыроды забяспечвае добры ўраджай, які трэба пачынаць збіраць. Збіранне напярэдадні летняга сонцавароту зёлак і лекавых раслін. Парадак, калі адразу пасля летняга сонцавароту пачыналі спачатку касіць сена, потым – жаць жыта, пазней – талакой дажынаць яго і святкаваць разам заканчэнне жніва. Сувязь паміж плоднасцю прыроды і чалавека ў тэкстах працоўных песень.

*Тэма 7. «Цяцерка», «Сядзеў казёл на гарэ»*

Рэгіянальныя летнія святы і Купалле – час яднання супольнасці, пазбаўлення ад адзіноты. Наяўнасць уяўленняў пра дэманічную прыроду тых людзей, што хаваюцца ад супольнасці ў гэты час. Шырокае распаўсюджанне калектыўных карагодаў і гульняў у летні перыяд.

Жніўны комплекс свят Зажынкі, Жніво і Дажынкі, аб'яднаных адным напрамкам – зборам зерня (асновы будучага хлеба). Дажынкі як найбольш святочная частка комплексу і ўяўленні пра казлападобнага духу нівы і завіванне яго барады для плоднасці поля. Звычай, па якім, пасля таго, як барада завіта, апошні сноп урачыста адносілі гаспадару, які частаваў жней, потым – усе збіраліся разам, святкавалі, танцавалі і гулялі ў гульні: радаваліся паспяховаму завяршэнню жніва, паказвалі, што жыццё працягваецца і людзі яго прымаюць весела. Завяршэнне дажынкавага свята, якое пачыналася з завівання «барады». Песні жніўнага часу як неад'емная частка гукавой партытуры лета.

*Тэма 8. Выкананне летняга рэпертуару капэлы*

Развучванне найгрышу да песні «Пойдзем дзеўкі (Лыгулыгу)» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі. Развучванне найгрышу да песні «Касары косяць» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі. Развучванне найгрышу да гульні «Цяцерка» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі. Развучванне найгрышу да гульні «Сядзеў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

казёл на гарэ» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі.

## Раздзел 3. Восеньскі рэпертуар капэлы

### *Тэма 9. «Ластаўка»*

Сяляне Беларусі, якія адпачываюць ад летняй працы, і іх восеньскія песні як роздум і назіранне за наваколлем, «перакліканне» з галасамі птушак, якія адляталі, каб іх «не схапілі» халады, у мясціны, дзе круглы год цёпла – на поўдзень. Восеньскія працоўныя песні і песні-балады (агульная характарыстыка).

Рэгіянальныя балады як прыклад восеньскай лірыкі беларусаў. Дэкламацыя і (як наступны этап) спевы тэксту восеньскай песні.

### *Тэма 10. «Базар», «Падушачка»*

Восень як час, які надыходзіць пасля гарачыні лета, калі Сонцу па народных уяўленнях трэба адпачыць, набрацца сіл; дні становяцца карацейшымі, а ночы падаўжаюцца. Сканчэнне працы па ўборцы ўраджаю, калі народ у вёсках і мястэчках Беларусі пачынаў весела і няспешна адпачываць. Час, калі людзі збіраліся разам, каб паслухаць музыку, спявалі і танцавалі на кірмашах і святах ураджаю. Адлюстраванне рэкрэацыйнага і разняволенага настрою ў восеньскім фальклорным рэпертуары.

Восеньскі адпачынак у Піліпаўку (падрабязнае тлумачэнне пра пост, яго медыцынскі і псіхатэрапеўтычны плён для здароўя), праца і хатнія гульні моладзі (агульная характарыстыка), якія яго суправаджалі.

Выкананне дэкламацыі слоў і напеву рэгіянальнай песні-гульні. Суіснаванне і спалучэнне гульняў з песнямі і побытавым танцам у паводзінавай культуры беларусаў. Паўтарэнне слоў і напеву восеньскай песні, прыпевак і рухаў да побытавага танца з папярэдніх заняткаў.

### *Тэма 11. «Кракавяк»*

Восеньскія фэсты, кірмашы, звязаныя з імі жанры балад і прыпевак да танцаў. Словы, напеў, харэаграфічныя рухі і ін-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

струментальнае суправаджэнне прыпевак да абранага рэгіянальнага побытавага танца.

Выкананне дэкламацыі слоў і напеву прыпевак да абранага рэгіянальнага побытавага танца. Спалучэнне вербальнага тэксту (наступны этап – спеваў) з рухамі.

*Тэма 12. Выкананне восеньскага рэпертуару капэлы*

Развучванне найгрышу да песні «Ластаўка» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі. Развучванне найгрышу да танца «Базар» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі.

## Раздзел 4. Зімовы рэпертуар капэлы

*Тэма 13. «Грушка», «Прыйшла Каляда»*

Зіма як час, які надыходзіць пасля восені, калі Сонцу па народных уяўленнях трэба «развярнуцца на лета»; час самых кароткіх дзён і самых доўгіх начэй у годзе – калядных. Часовае «паміранне» прыроды і згасанне прыродных працэсаў пад націскам халадоў. Доўгі Піліпаўскі пост як прэлюдыя зімы, яго хатнія цырымоніі і гульні (характарыстыка ў кантэксце прадчування Калядаў). Адлюстраванне размеранасці і нетаропкасці перадкаляднага сезона ў напевах і рытміцы зімовых гульняў.

Каляды як апагей зімовага перыяду, час Крывых вечароў, калі свет карнавалізуецца, Сонца «паварочвае на лета, а зіма – на мароз», звычайны парадак часова адмяняецца, і надыходзяць шумныя і вясёлыя Тры Куцці (прымеркаваныя да Раства – Васілля – Вадохрышча). Адлюстраванне «пераломнасці» сезона ў шумных абыходных песнях-калядках.

*Тэма 14. «Цярэшка», «Лявоніха»*

Варыятыўнасць калядных святкаванняў і песень у Беларусі: Ваджэнне Казы на Падняпроўі і Палессі, Жаніцьба Цярэшкі ў Цэнтральнай Беларусі і на Падзвінні, Тры Каралі на Панямонні. Звесткі пра мясцовыя калядныя песні-шчадроўкі (вёскі, раёна, гісторыка-этнаграфічнага рэгёна), адрозненні іх рэфрэна ад каляднага. Знаёмства (фізічнае ці віртуальнае) з мясцовымі майстрамі спеўнага фальклору.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Лявоніха» як рытуальны танец калядных хатніх цырымоній Цэнтральнай Беларусі і Падзвіння і прыпеўкі да яе. Яе характарыстыка: музычны памер, парна-гуртавы характар, прыпеўкі пад рухі, смыкавы і дударскі акампанемент, суадносіны з мясцовай традыцыяй.

Словы, напеў, харэаграфічныя рухі і інструментальнае суправаджэнне песні «Лявоніха».

*Тэма 15. Выкананне зімовага рэпертуару капэлы*

Развучванне найгрышу да гульні «Грушка» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі. Развучванне найгрышу да песні «Прыйшла Каляда» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі. Развучванне найгрышу да танца-гульні «Цярэшка» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі. Развучванне найгрышу да танца «Лявоніха» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі.

*Тэма 16. Выкананне міжсезоннага танцавальнага рэпертуару капэлы*

Развучванне найгрышу да гульні «Падушачка» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі. Развучванне найгрышу да танца «Кракавяк» і яго выкананне капэлай смыкавай і дударскай музыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | | |
| | Уводзіны. Знаёмства з інструментамі капэлы | 2 | | | |
| **Раздзел 1. Веснавы рэпертуар капэлы** | | | | | |
| 1. | «Яваравы мост» | 2 | | | |
| 2. | «Ды ішла туча, туча цёмная» | 2 | | | |
| 3. | «У Юрачку», «Як пушчу стряло» | 2 | | | |
| 4. | Выкананне веснавога рэпертуару капэлы | | 2 | | |
| **Раздзел 2. Летні рэпертуар капэлы** | | | | | |
| 5. | «Пойдзем дзеўкі (Лыгу-лыгу)» | 1 | | | |
| 6. | «Касары косяць» | 1 | | | |
| 7. | «Цяцерка», «Сядзеў казёл на гарэ» | 2 | | | |
| 8. | Выкананне летняга рэпертуару капэлы | | 2 | 2 | аўдыявізуальная прэзентацыя |
| **Раздзел 3. Восеньскі рэпертуар капэлы** | | | | | |
| 9. | «Ластаўка» | 2 | | | |
| 10. | «Базар», «Падушачка» | 1 | | | |
| 11. | «Кракавяк» | 1 | | | |
| 12. | Выкананне восеньскага рэпертуару капэлы | | 2 | 2 | рэферат |
| **Раздзел 4. Зімовы рэпертуар капэлы** | | | | | |
| 13. | «Грушка», «Прыйшла Каляда» | 2 | | | |
| 14. | «Цярэшка», «Лявоніха» | 2 | | | |
| 15. | Выкананне зімовага рэпертуару капэлы | | 1 | 1 | выкананне фальклорных адзінак |
| 16. | Выкананне міжсезоннага танцавальнага рэпертуару капэлы | | 1 | 1 | выкананне фальклорных адзінак |
| | **Разам…** | **20** | **8** | **6** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*1. Алехнович, О. М.* Дуда, волынка, коза, козица / О. М. Алехнович // Восточнославянский фольклор : слов. науч. и нар. терминологии / редкол.: К. П. Кабашников (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – С. 63–64.

*2.* Анталогія беларускай народнай песні / уклад., прадм. і камент. Г. Цітовіча. – Мінск : Беларусь, 1975. – 616 с.

*3.* Беларускія народныя песні : са зб. П. Шэйна / рэд. У. Дамашэвіч, склад. К. Кабашнікаў. – Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1962. – 430 с.

*4.* Вясна на Беларусі : рэпертуарны зб. / уклад.: В. Калацэй, Т. Пладунова. – Мінск : НЦТДіМ, 1998.

*5.* Гульні, забавы, ігрышчы / уклад. А. Лозка. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 534 с.

*6.* Дударская музыка : метад. дапам. / склад.: В. В. Калацэй, В. М. Кульпін, В. А. Красулін. – Мінск : БДУКМ, 2011. – 52 с.

*7.* Капэла беларускай смыковай и дударскай музыкі : інфарм. рэсурс / склад.: В. В. Калацэй, В. М. Кульпін, В. А. Красулін. – Мінск : БДУКМ, 2013.

*8. Кодай, З.* Учебное пособие по сольфеджио / З. Кодай. – М. : Композитор, 1993. – 168 с.

*9. Козенка, М. А.* Лексіка беларускага народна-сцэнічнага танца / М. А. Козенка. – Мінск : Полымя, 1993. – Частка І. Паставы рук. – 112 с.

*10. Мацieўскі, І.* Музычныя спецыялісты традыцыйнай культуры (псіхолага-культуралагічная праблематыка) / І. Мацieўскі // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзельнікаў V Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 29 крас. – 1 мая 2011 г. / БДУКМ ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2011. – С. 11–14.

*11. Мацieўскі, І.* Этнічная музыка ў трэцім тысячагоддзі: пытанні трансляцыі / І. Мацieўскі // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзельнікаў VI Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 27–29 крас.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2012 г. / БДУКМ ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2012. – С. 209–210.

*12. Можейко, З. Я.* Песенная культура белорусского Полесья. Село Тонеж / З. Я. Можейко / ред. Е. В. Гиппиус. – Минск : Наука и техника, 1971. – 264 с.

*13. Можейко, З. Я.* Экология традиционной народно-музыкальной культуры: нематериальная культура Беларуси в свете социально-экологических проблем / З. Я. Можейко. – Минск : Беларус. навука, 2011. – 147 с.

*14.* Мядоцкі край і яго таленты : Даведнік фестывалю (30 мая – 1 чэрв. 1997 г., в. Мётча) / уклад. М. Козенка. – Мінск : ВЛАДИ-АРТ, 1997. – 109 с.

*15. Назаренко, И. К.* Искусство пения: Очерки и материалы по истории, теории и практике художественного пения : хрестоматия / И. К. Назаренко. – М. : Музыка, 1963. – 511 с.

*16. Назіна, I. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / I. Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.

*17.* Практычная этнафонія: генезіс і сучасны стан : метад. дапам. / склад. В. В. Калацэй. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 62 с.

*18.* Смыковая і дударская музыка : вучэб.-метад. дапам. / склад.: В. В. Калацэй, В. М. Кульпін, В. А. Красулін. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 123 с.

*19.* Смыковая музыка : метад. дапам. / склад.: В. В. Калацэй, В. М. Кульпін, В. А. Красулін. – Мінск : БДУКМ, 2011. – 42 с.

*20.* Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 1. Магілёўскае Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.] ; склад. Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 797 с.

*21.* Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка [і інш.] ; склад. Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 910 с.

*22.* Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка [і інш.] ; склад. Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 2006. – 910 с.

*23.* Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 5. Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.] ;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2011. – 911 с.

*24.* Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 5. Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2010. – 847 с.

*25.* Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. / А. М. Боганева [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2013. – 1231 с.

*26.* Ударныя інструменты ў капэле смыковай і дударскай музыкі : метад. дапам. / склад.: В. В. Калацэй, В. М. Кульпін, В. А. Красулін. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 47 с.

*Дадатковая*

*1. Емельянов, В. В.* Развитие голоса: Координация и тренаж / В. В. Емельянов. – СПб. : Лань, 1997. – 190 с.

*2. Калацэй, В.* Параўнальная міфалогія / В. Калацэй. – Мінск : Зорны верасень : Паркус плюс, 2009. – 116 с.

*3. Мельникова, Л. И.* Детский музыкальный фольклор в дошкольных образовательных учреждениях (на примере земледельческих праздников) / Л. И. Мельникова, А. Н. Зимина. – М. : Гном-Пресс, 2000. – 88 с.

*4. Мухарынская, Л. С.* Беларуская народная музычная творчасць : вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л. С. Мухарынская, Т. С. Якіменка. – Мінск : Выш. шк., 1993. – 343 с.

*5. Назаренко, И. К.* Искусство пения: Очерки и материалы по истории, теории и практике художественного пения : хрестоматия / И. К. Назаренко. – М. : Музыка, 1963. – 511 с.

*6. Науменко, Г. М.* Фольклорная азбука : учеб. пособие для начальной школы / Г. М. Науменко. – М. : Академия, 1996. – 136 с.

*7.* Специфика учебно-воспитательной работы в фольклорных певческих коллективах : метод. пособие. – М. : ВНМЦНТиКПР, 1984. – 103 с.

*8.* Фольклорный ансамбль // Музыка : Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ. – М. : Просвещение, 1986. – С. 356–366.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Цітоў, В. С.* Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі : вучэб.-метад. дапам / В. С. Цітоў. – Мінск : Беларусь, 1996. – 208 с.

10. *Хазова, М. В.* Горенка: Комплексное изучение музыкального фольклора / М. В. Хазова // Фольклор – музыка – театр : Программы и конспекты занятий для педагогов дополнительного образования, работающих с дошкольниками / под ред. С. И. Мерзляковой. – (Воспитание и доп. образование детей). – М. : Владос, 1999. – 120 с.

*Кіна-, відэаграфія*

*1.* Голоса веков / сцен. З. Можейко. – «Беларусьфільм», ВА «Летапіс», 1979.

*2.* Память столетий / сцен. З. Можейко. – «Беларусьфільм», ВА «Летапіс», 1982.

*3.* Пранясі, Божа, хмару / сцэн. З. Мажэйкі. – «Беларусьфільм», ВА «Летапіс», 1990.

*4.* Рух зямлі / сцэн. З. Мажэйкі. – «Беларусьфільм», ВА «Летапіс», 1999.

*5.* Мужчынскі рой / сцэн. Г. Таўлай, рэж. С. Гайдук. – РУП «Белвідэацэнтр», 1995.

*6.* Мотальскія байкі / сцэн. і рэж. В. Пестаў. – РУП «Белвідэацэнтр», 1990.

*7.* Карагод / сцэн. М. Козенкі, рэж. і апер. А. Шклярэўскі. – РУП «Белвідэацэнтр», 1995.

*8.* Беларускае адзенне / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

*9.* Былічкі / сцэн. Р. Гамзовіч. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1996.

*10.* Вяселле ў Моталі. Абрад «свахі» / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. М. Зарэмба. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

*11.* Жураўка / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1999.

*12.* Культ продкаў / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1997.

*13.* Культ продкаў / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

*14.* Стравы на Дзяды / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча. – ТА «Радавод» Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

*15.* Капэла смыковай і дударскай музыкі / сцэн. В. Калацэй. – БДУКМ, 2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– выканальніцкая практыка;

– падрыхтоўка прэзентацый;

– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– выканальніцтва на інструменце капэлы сольна і ў ансамблі;

– вуснае апытанне студэнтаў на практычных занятках па распрацаваных тэмах.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Капэла смыкавай і дударскай музыкі»

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па агульным напрамку «Капэла смыкавай і дударскай музыкі» па адной з тэм, якія прыведзены ніжэй. Пры афармленні яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры.

Тэматыка самастойнай работы з'яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму. Пры напісанні работы можна выкарыстоўваць літаратуру па курсе.

## Формы выканання самастойнай работы:

– выкананне самастойна перанятых фальклорных адзінак (2 сольных інструментальных найгрышаў, 2 песень з уласным інструментальным суправаджэннем, 2 дуэтных інструментальных найгрышаў);

– напісанне рэферата (не менш 12 старонак);

– распрацоўка візуальнай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў);

– распрацоўка аўдыявізуальнай прэзентацыі (не карацей за 2 хвіліны дэманстрацыі).

## Прыкладныя тэмы для самастойнай работы

1. Веснавыя гульні Беларусі.
2. Арнаментальна-драматычная гульня ў веснавы перыяд.
3. Валачобная абраднасць.
4. Валачобныя песні.
5. Драматычная гульня ў веснавы перыяд.
6. Веснавыя песні Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Веснавыя карагоды.
8. Песні Зялёных Святкаў.
9. Купальскія песні беларусаў.
10. Купальская песня-карагод.
11. Арнаментальна-драматычная гульня ў летні перыяд.
12. Арнаментальная гульня ў летні перыяд.
13. Працоўныя песні лета.
14. Песні касавіцы.
15. Песні жніва і дажынак.
16. Побытавы танец на восеньскіх кірмашах і фэстах Беларусі.
17. Прыпеўкі да побытавага танца.
18. Песні-балады восені.
19. Восеньскія песні беларусаў.
20. Гульня са спевамі і рытмічнымі рухамі (арнаментальная) у восеньскі перыяд.
21. Гульня з формульным тэкстам і дыялогамі (драматычная) у восеньскі перыяд.
22. Побытавыя танцы (парныя і з няцотнай колькасцю выканаўцаў) у восеньскіх святах Беларусі.
23. Побытавы танец з рознай колькасцю выканаўцаў на восеньскіх вячорках.
24. Зімовыя песні і гульні беларусаў.
25. Песні зімовых ігрышчаў.
26. Песні калядных абыходаў.
27. Песні-калядкі і песні-шчадроўкі.
28. Песні калядных хатніх цырымоній.
29. Калядныя містэрыі беларусаў.
30. Песні калядных містэрый.
31. Гульні і танцы зімовых свят.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**КАПЭЛА СМЫКАВАЙ І ДУДАРСКАЙ МУЗЫКІ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-18 01 01*
*Народная творчасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,76. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ